# ВЫДРА
БЕЛАРУСКАЯ

Выданьне Рады
Беларускай суполкі
у Чэхіі «Скарына»

**N1, сакавік 2005**




## ВАНДАЛІЗМ

Невядомыя злачынцы скралі бронзавы напіс з помніка Ф. Скарыне ў Празе, які знаходзіцца паміж міністэрствам культуры й міністэрствам замежных спраў ЧР.

Помнік быў усталяваны на праскіх Градчанах у 1996 годзе. Апроч гэтага помніка Ф.Скарыне ў Празе прысьвечана мемарыяльная шыльда ў Клеменцінуме.

Цяперашні акт вандалізму не ёсць першым ў дачыненьні да беларускіх сьвятыняў, з якім давялося сутыкнуцца беларускай грамадзе ў Празе. Так, напрыклад, у верасьні 2001 года быў зрынуты камень ля гэтага ж помніка.

Здаецца, што сітуацыя з помнікам цалкам нагадвае вядомую показку: у сямі нянек дзіця без вока. Намінальна гэтым помнікам мусілі б апякацца:

- Беларуская Амбасада ў Чэхіі
- Міністэрства культуры ЧР – таму што пашкоджаны аб'ект культуры (тым больш што месьціцца яно ледь не ў ста кроках ад помніка)
- Міністэрства ўнутраных спраў Чэхіі (чым абавязкам есць як найхутчэй дасьледваць гэтую справу і знайсьці вінаватых).

*працяг на старонцы 2*

# З ГІСТОРЫІ ЗАСНАВАНЬНЯ СУПОЛКІ

*5–га лютага ў сядзібе суполкі “Скарына” адбылася сустрэча й размова сябраў зь першым старшынёй суполкі (1997-2000), цяперашнім сябрам Рады суполкі й старшынёй Каардынацыйнае Рады Дэмакратычнага Форуму Беларусаў Эўропы спадаром Юркам Станкевічам. Тэма размовы – заснаваньне беларускай суполкі у Празе.*

**І.Паўловіч: Просім спадара Юрку распавясьці, як стварылася беларуская суполка ў Празе, хто фактычна быў ініцыятарам заснаваньня суполкі.**

Суполка была заснаваная ў 1997 г. Ідэя з’явілася на Радыё «Свабода». Ініцыятыва стварэньня суполкі зыходзіла больш не ад кіраўніцтва, але ад паасобных сяброў беларускай сэкцыі. Хто найбольш прычыніўся да таго – гэта быў доктар Мікола Іваноў, які тады яшчэ працаваў на «Свабодзе». Сяржук Сокалаў-Воюш прымаў заўсёды ўдзел у нашых зборках. У той перыяд да 2000 г. - ён тады быў скарбнікам суполкі. І ўпрасілі мяне стацца старшынёй. Адна з прычынаў запрашэньня мяне на старшыню – што ўмею гаварыць па-чэску.

**Т.Кажамяка: прыпомніце, калі ласка, найцікавейшыя мерапрыемствы, якія ладзіла суполка на пачатку дзейнасьці.**



Спачатку шмат мерапрыемстваў не адбывалася. Доўгі час мы зьбіраліся меньш-больш рэгулярна, але, нажаль, толькі у зальках розных рэстаранаў (гасподаў). У гэты перыяд шмат дапамагала чэская арганізацыя «Чалавек у нядолі»: яны запрашалі на сустрэчы беларускіх студэнтаў, журналістаў, юрыстаў; прыяжджалі і з Беларусі цікавыя людзі – Мікола Маркевіч быў два разы, Павел Мажэйка… - было так вельмі добра, пакуль гаспадары гасподаў не адмовілі нам у правядзеньні сустрэчаў, бо прыбытку ад нас было мала: мала быццам замаўлялі зь ежы ды выпіўкі.

З буйнейшых мерапрыемстваў можна прыпомніць такія: як заўсёды, сьвяткавалі Дзень Волі 25 сакавіка. Першы раз, у 1997 годзе, калі толькі зарэгістравалі суполку, правялі проста акцыю пратэсту супраць дыктатуры Лукашэнкі на Вацлаўскай плошчы. Сябры суполкі тады раздалі некалькі соцен інфармацыйных лісткоў на чэскай і ангельскай мове.

Цікавымі былі выстава й навуковая канфэрэнцыя, якую наладзілі ў супрацоўніцтве з Нацыянальнай Бібліятэкай ЧР і Славянскім аддзелам Акадэміі Навук ЧР. Галоўным ініцыятарам акцыі была вышэйпрыпамянутая ужо спадарыня Франьцішка Соколова – працаўніца бібліятэкі, выдатная дасьледвальніца дзейнасьці Ф.Скарыны ў Празе й беларускага кнігадруку сярэдневечча.

У наступным – 1998 годзе – Дзень Волі сьвяткавалі ўжо ў Národním Dome na Vinohradéch, канцэлярыя прэзыдэнта Вацлава Гаўла даслала тады віншаваньне ўдзельнікам; у красавіку ў супрацоўніцтве з Гэльсінскім камітэтам мы сустракаліся з чэскімі дысыдэнтамі, якія падпісалі Хартыю 77; у траўні разам з арганізацыяй «Чалавек у нядолі» наладзілі дыскусію «Якая яна – сёньнешняя Беларусь?»; увосень правялі пікет перад амбасадай РФ супраць падтрымкі дыктатуры лукашэнкі кіраўніцтвам Расеі.

А так, як ужо казаў – прынамсі большай часткай сустракаліся з беларускімі журналістамі, юрыстамі й г.д. у пражскіх гасподах.

Зборкі ў гасподах скончыліся прыблізна ў 1999 годзе. Дзякуючы зноў жа дапамозе доктара Міколы Іванова мы пайшлі ў бібліятэку – (Нацыянальная Бібліятэка ЧР (каментар І.П.) – знайшлі магчымасьць зьбірацца ў «Zasedaci Sini» N136 даволі рэгулярна, гэта было задармо. Рэгулярнасьць штомесячных зборак дазволіла зьвярнуцца з просьбай да бібліятэкі й выкарыстоўваць іхную Люстраную Залю, й з 2000 г. мы яе выкарыстоўвалі, й таксама спачатку не плацілі за яе.

*працяг на старонцы 2*

*З Прамовы сп. Станкевіча 05.09.1997 г. на вэрнісажы выставы, прысьвечаным 480-годдзю беларускага кнігадруку, якая адбывалася ў Славянскай бібліятэцы ў Празе: «Суполка «Скарына» была заснавана на прыканцы 1996 г. і зарэгістравана ў ЧР як грамадская арганізацыя ў студзені 1997 г. Мэта суполкі – пашырыць веды аб Беларусі, беларускім народзе, яго гісторыі, мове й культуры ды падтрымаць чэшска-беларускія сувязі.»*

# З ГІСТОРЫІ ЗАСНАВАНЬНЯ СУПОЛКІ

*працяг са старонкі 1*

**Т.Кажамяка: Хто найчасьцей прысутнічаў на першых зборках суполкі?**

Сокалаў-Воюш і Максім Шчур прыходзілі з гітарамі й сьпявалі беларускія песьні, Мікола Іваноў, Алена Ціхановіч, якая ў той час была заступнікам і адначасова - сакратаром, Сяржук Абламейка, Воля Абламейка…

**І.Паўловіч: А калі Вы прыехалі ў Чэхію?**

У 1996 г. пачалося стварэньне суполкі, а я ўжо быў тут 3 гады. Беларускай суполкі дагэтуль тут не было.

**І.Паўловіч: З чаго пачаліся Вашыя кантакты з працаўнікамі Радыя?**

Мой брат кіраваў сэкцыяй у Мюнхэне, і я яго наведваў як брата. Там пазнаёміўся са спадаром Лукашуком, спадаром Сяржуком Сокалавым, іншымі, але мала меў дачыненьня зь імі фактычна. Калі Радыё пераехала ў Прагу, так пазнаў іх больш, бо тут блізка й таму, што пачалі ствараць суполку. Мікола Іваноў, Сяржук Сокалаў-Воюш найбольш дбалі пра яе стварэньне.

**І.Паўловіч: А як назва з'явілася? Хто прапанаваў менавіта такую назву?**

Было шмат прапановаў, але думка менавіта гэтая была сп-ра Госкоўца, старшыні падрыхтоўчага камітэта, які займаўся рэгістрацыяй нашай суполкі. Ён прапанаваў не шукаць складаную назву, а проста – «Скарына». Дзеля рэгістрацыі суполкі трэба было мець падрыхтоўчы камітэт, дзе найбольш нам памог спадар Тамаш Госковэц – прафесар летуваністыкі ў Брне. Са спадаром Госкаўцом нас пазнаёмілі спадарыня Франьцішка Сокалава й спадар Сяргей Шупа. Спадар Госковэц, у сваю чаргу, знайшоў яшчэ двух чэскіх грамадзянаў, і яны нам дапамаглі зарэгістраваць суполку.

*З Прамовы сп. Станкевіча 05.09.1997 г.: «У перыяд панаваньня камуністычнага рэжыма ў Чэхаславакіі беларускае жыцьцё практычна адмерла. Некаторыя з былой студэнцкай інтэлігенцыі былі дэпартаваныя да СССР; іншыя таілі сваё беларускае паходжаньне. Пасьля 1989 г., а галоўным чынам, пасьля пераезду Радыя «Свабода» з Мюнхена у Прагу жыццё беларускай грамады ў ЧР аднавілася. Акрамя працаўнікоў Радыё «Свабода» у ЧР цяпер знаходзіцца групоўка беларускай моладзі, якая тут у асноўным вывучае тэялёгію й эканоміку».*

**Г.Кажамяка: Як цяпер ставіцца спадар Госковэц да нашай суполкі?**

Вельмі прыязна. Фактычна, яшчэ ў тыя часы ніхто з нас ня быў чэскім грамадзянінам, дзякаваць Богу, гэта была вялікая дапамога з яго боку: быў сам і знайшоў яшчэ двух, хто увайшлі ў падрыхтоўчы камітэт.

**Г.Кажамяка: Але яны засталіся заснавальнікамі суполкі?**

Такога няма – заснавальнікаў. Быў фармальны падрыхтоўчы камітэт. Гэты камітэт выпрацаваў Статут суполкі, які затым быў зарэгістраваны ў МУС, і на гэтым ягоная функцыя скончылася.

**І.Паўловіч: А на якія сродкі існавала арганізацыя?**

Выбіраліся складкі. Гэта была справа Сяржука Сокалава, як скарбніка.

**І.Паўловіч: Як і калі скончылася Вашае старшынства ў суполцы?**

У восені 1999 г. я паведаміў сябраў суполкі на чарговым паседжаньні, што не змагу надалей належным способам выконваць абавязкі старшыні, бо ад пачатку лета пачаў займацца выдавецтвам англамоўнага квартальніка Belarusian Review і прапанаваў, каб кіраўніцтва суполкі пераняў хтосьці з працаўнікоў Радыя, канкрэтна прапанаваў абраць Д-ра Міколу Іванова. Але спадара Міколы на той зборцы не было, й пытаньне засталося невырашанае – аж да восені 2000 г. Тады у суполцы з'явілася спадарыня Г.Сурмач, і я прапанаваў яе кандыдатуру на Старшыню суполкі, бо, як апошні абраны старшыня Рады ЗБС "Бацькаўшчына" яна мела вялікае дасьведчаньне у працы грамадскіх арганізацыяў, і, я спадзяваўся, што як гісторык з прафэсіі магла б падняць ўзровень культурнага жыцьця суполкі. Спадарыня Ганна Сурмач была абрана Старшынёй у кастрычніку 2000 г., а я пераняў функцыю сакратара – аж да сьнежня 2003 г.

***Прага, 5 лютага 2005***

## ДАКУМЭНТ

# ПРАГРАМА КУЛЬТУРНЫХ АКЦЫЯЎ СУПОЛКІ НА РОК 2005

У якасьці асноўнага накірунку дзейнасьці суполкі ў 2005 г. Рада суполкі прызначыла наладжваньне беларускага жыцьця ў Чэхіі праз культурна-асьветніцкую дзейнасьць рэгулярнага характару:

1. **Адзначэньне выдатных гістарычных датаў (угодкаў):**
   - Дня Волі (25 сакавіка);
   - Бітвы пад Воршай;
   - Слуцкага збройнага Чыну;
   - іншых.
2. **Правядзеньне традыцыйных беларускіх сьвятаў:**
   - касьцюмаваных Калядаў;
   - Гуканьня вясны або Масьлёнкі;
   - Купальля з вогнішчам,
   - Дзядоў;
   - іншых
3. **Дзіцячая праграма:**
   - наладжваньне школкі для дзяцей (з націскам на вывучэньне беларускай мовы): чытаньне беларускіх казак, апавяданьняў, вершыкаў; вывучэньне песенькаў, пазьней - правапісу;
   - набыцьцё у кнігоўню суполкі дзіцячай літаратуры ("Лемантар", інш.)
4. **Правядзеньне інфармацыйных зборак на тэмы карысныя ў сучасным жыцьці:**
   - карыстаньне Інтэрнэтам і тварэньне вэбавых старонак;
   - набор і вёрстка друкаваных выданьняў;
   - законы Чэскай Рэспублікі;
   - іншых
5. **Арганізацыя выданьня друкаванага інфармацыйнага выданьня суполкі з выхадам мінімальна адзін раз у месяц**
6. **Наладжваньне сэрыі лекцыяў па гісторыі Беларусі**
7. **Пашырэньне кантактаў з замежнымі супольнымі арганізацыямі**
8. **Арганізацыя сумесных падарожжаў па Чэхіі (пазьней і па Эўропе)**
9. **Арганізацыя сустрэчаў з запрошанымі з Беларусі, альбо іншых краінаў мастакоў, мастацкіх калектываў, пісьменьнікаў**
10. **Далейшае развіцьцё бібліятэкі суполкі, абавязковае набыццё:**
    - Падручніка беларускай мовы для расейскамоўных (С.Аляксандраў, Г.Мыцык "Гавары са мной па-беларуску");
    - Зборніка народных і патрыятычных песьняў;
    - Дзіцячай літаратуры ("Лемантар", інш.)

# ВАНДАЛІЗМ

*працяг са старонкі 1*

Пакінем дзеяньні вышэй ўзгаданых арганізацыяў на іхным сумленьні і сканцэнтруем увагу на тым, што нагляд за беларускімі сьвятынямі есьць справай гонару і статутным абавязкам тых арганізацый беларусаў - зьвязаў і суполак, якія існуюць у Чэхіі.

Гэтай публікацыяй мы заклікаем усе зацкаўленныя арганізацыі й грамады: РАТУЙЦЕ ПОМНІК!

Нажаль, суполка «Скарына» не мае пэўных фінансавых рэсурсаў каб аднавіць помнік і абмежавана ў дзеяньнях тым расколам, які адбыўся ў суполцы напрыканцы мінулага года.

Але Рада суполкі выступае са зваротам да іншых зацікаўленых арганізацый зрабіць рэзам наступныя крокі, каб вырашыць сітуацыю:

- даслаць сумесны афіцыйны зварот у Міністэрства ўнутраных справаў;
- надаць гэтаму факту належны грамадскі рэзананс;
- правесьці талаку, калі тое вымагае сітуацыя

Бо гэта наш гонар, бо гэта помнік «бацьку беларускай нацыі»!

***А.Скаруліс, Швайцарыя***

ВЫДРА БЕЛАРУСКАЯ - Выданьне Рады Беларускай суполкі ў Чэхіі «Скарына». N1, сакавік 2005. E-mail: vydra@skaryna.net
Рэдакцыйная калегія: Рыгор Жыдкоў, Генадзь Кажамяка, Іна Паўловіч, Андрэй Рамашэўскі (рэдактар), Арсеній Скаруліс, Сяргей Скаруліс, Юрка Станкевіч.
© 2005 Суполка «Скарына». Усе правы абаронены. Перадрукоўка цэлых тэкстаў альбо частках с абавязковай спасылкай на першакрыніцу дазволена.
Пры падрыхтоўцы выданьня была выкарыстана вольнае праграмовае забясьпячэньне - vim, gimp, inskape, scribus пад апэрацыйнай сістэмай Debian Linux